www.gazeta.bsu.by

УНІВЕРСІТЭТ

Газета Беларускага дзяржаўнага універсітэта

25 мая 2006 года, № 11 (1941)

ВІНШУЕМ!

ГАНАРОВЫ ІНСТЫТУТ

Установа БДУ "Навукова-даследчы інстытут фізіка-хімічных праблем" Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь № 279 ад 28 красавіка 2006 г. занесеная на Рэспубліканскую дошку Гонару.

НДІ ФХП заняў першае месца сярод арганізацый навукі і навуковага абслугоўвання за дасягненні ў 2005 годзе найлепшых вынікаў у выкананні асноўных мэтавых паказчыкаў прагнозу сацыяльна-эканамічнага развіцця. Па словах дырэктара НДІ ФХП Алега Івашкевіча, пры вызначэнні пераможцаў улічвалася эканамічная эфектыўнасць працы, укараненне навуковых распрацовак у практыку, колькасць абароненых дысертацый, станоўчая дынаміка асноўных паказчыкаў дзейнасці інстытута і інш. Нагадаем, што Рэспубліканская дошка Гонару знаходзіцца каля Нацыянальнага выставачнага цэнтра "БелЭкспа". Плануецца, што пераможцы спаборніцтва атрымаюць грашовыя сродкі з рэспубліканскага бюджэту.

Валянціна КЛЯНІЦКАЯ

ГОСЦІ

ЖУРФАКІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

У маі БДУ наведалі студэнты Йельскага універсітэта (ЗША) — 12 юнакоў і дзяўчат з эканамічнага факультэта, факультэтаў журналістыкі і міжнародных адносінаў. Яны сустрэліся з кіраўніцтвам нашага універсітэта, студэнтамі і выкладчыкамі факультэта міжнародных адносін БДУ, рэдакцыяй газеты "Універсітэт" і прэс-службай універсітэта.

На сустрэчы з кіраўніцтвам БДУ амерыканцы цікавіліся працаўладкаваннем, а таксама папулярнымі ў БДУ спецыяльнасцямі і тым, як студэнты выбіраюць іх для сябе: па прэстыжнасці ці па асабістых захапленнях. Шмат пытанняў было пра Чарнобыль і яго наступствы.

Амерыканцы расказалі пра свой праект "The Globalist Foundation", у якім бяруць удзел універсітэты Сіднея (Аўстралія), Пекіна (Кітай), Таронта (Канада), Кембрыджа (Англія), Берліна (Германія), Кейптаўна (ПАР). Яны вось ужо 5 гадоў сумесна выдаюць часопіс "The Yale Globalist" (тыраж болей за 5000 экзэмпляраў, выдаецца 1 раз у год). Паўдзельнічаць у выданні часопіса амерыканскія госці запрасілі студэнтаў журфака БДУ. "Мы цікавімся гісторыяй, эканомікай, грамадска-палітычным жыццём, сістэмай адукацыі Беларусі, а таксама праблемай Чарнобыльскай аварыі", — кажа прадстаўніца рэдкалегіі часопіса "The Yale Globalist" Элеанора Шэрыф.

Яна прапанавала студэнтам журфака БДУ рабіць нацыянальны выпуск часопіса пра нашу краіну: яго будуць перакладаць на англійскую мову і дасылаць у астатнія універсітэты-ўдзельнікі праекта.

Валянціна КЛЯНІЦКАЯ
Фота Юліі ПАПОВАЙ

ПАСЯДЖЭННЕ ВУЧОНАГА САВЕТА БДУ

Пасяджэнне Вучонага савета БДУ на тэму "Сучасны стан і далейшае развіццё вучэбна-выхаваўчай работы ў БДУ" адбудзецца 30 мая. З асноўным дакладам выступіць прарэктар па вучэбна-выхаваўчай рабоце і сацыяльных пытаннях Уладзімір Суворай. Пачатак мерапрыемства ў 10.15.

ВЕДАЙ НАШЫХ!

НАЙМАЦНЕЙШЫЯ Ў МАТЭМАТЫЦЫ

Першае месца ў рэспубліканскай студэнцкай алімпіядзе па матэматыцы, якая адбылася 19—21 мая, занялі студэнты БДУ. Пераможцамі сталі студэнты факультэта прыкладной матэматыкі і інфарматыкі Вікторыя Лебедзь (III курс) і Дзмітрый Дудко (IV курс), а таксама студэнт механіка-матэматычнага факультэта Іван Блізнец (I курс). Вікторыя Лебедзь паказала максімальны вынік, рашыўшы 6 задач з 6 магчымых.

У алімпіядзе ўдзельнічалі больш за 100 студэнтаў з 24 ВНУ краіны. Студэнты нашага універсітэта змагаліся за перамогу ў катэгорыі А, дзе 44 студэнты прадстаўлялі 8 класічных і педагагічных універсітэтаў. Студэнты БДУ занялі таксама II і III месцы.

ПОСПЕХІ Ў ХІМІІ

Навучэнцы 11 класа ліцэя БДУ Андрэй Ізотаў і Канстанцін Сіліч заваявалі срэбраны і бронзавы медалі на 40-й Міжнароднай Мендзялееўскай школьнай алімпіядзе па хіміі, якая адбылася на пачатку мая ў Ерэване. Усяго ж каманда Беларусі, куды ўваходзілі 6 прадстаўнікоў розных школ краіны, заваявала 1 залаты, 4 срэбраныя і 1 бронзавы медалі. Кіраваў камандай дацэнт кафедры фізічнай хіміі хімічнага факультэта БДУ Яўген Паўлечка. У алімпіядзе прымалі ўдзел 100 школьнікаў з 15 краін (Арменія, Беларусь, Балгарыя, Казахстан, Кыргызстан, Літва, Македонія, Малдова, Таджыкістан, Туркменістан, Расія, Румынія, Узбекістан, Украіна, Эстонія).

Паводле інфармацыі прэс-службы БДУ

ПЕРШАЕ МЕСЦА ПА ТУРЭЦКАЙ МОВЕ

Упершыню студэнтка I курса факультэта міжнародных адносін БДУ Вікторыя Трушко заняла I месца на V алімпіядзе па турэцкай мове, арганізаванай адукацыйна-культурнай установай "Дастлук". Удзел у ёй маглі ўзяць усе студэнты, якія вывучаюць турэцкую мову. Усяго было 23 удзельнікі з БДУ, МДЛУ, БДЭУ, Акадэміі кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь. У другі тур выйшлі 6 чалавек. Пераможца атрымала ў падарунак DVD-прайгравальнік, а таксама 2-месячную стажыроўку ў Турцыі.

Ірына ШЫК

ПАДЗЕІ

ЦАРКВА І ПРАБЛЕМЫ ГРАМАДСТВА

У Інстытуце тэалогіі імя святых Мяфодзія і Кірылы адбываюцца XII Міжнародныя Кірыла-Мяфодзіеўскія навуковыя чытанні (24—26 мая).

Тэма сёлетніх чытанняў — "Царква і сацыяльныя праблемы сучаснага грамадства". На форум атрымалі запрашэнне каля 200 навукоўцаў і спецыялістаў у галіне багаслоўя, гісторыі, філасофіі, сацыялогіі, філалогіі, юрыспрудэнцыі і эканомікі з ЗША, Італіі, Германіі, Польшчы, Босніі, Герцагавіны, Казахстана, Расіі, Славакіі, Украіны. Падчас чытанняў будуць працаваць 3 навуковыя секцыі па багаслоўі, у тым ліку студэнцкая (у яе рабоце прымуць удзел студэнты з Інстытута тэалогіі БДУ, Полацкага і Брэсцкага дзяржаўных універсітэтаў, Гомельскага і Гродзенскага медыцынскіх універсітэтаў, а таксама Маскоўскага Свята-Філарэтаўскага інстытута).

Паводле інфармацыі прэс-службы БДУ

НАВУКОВЫ ІНТАРЭС

СУПРАЦОЎНІЦТВА ПАШЫРАЕЦЦА

3—4 мая Беларускі дзяржаўны універсітэт наведала дэлегацыя кітайскай правінцыі Хэйлунцзян.

Дэлегацыю ўзначаліў намеснік старшыні Народнага сходу гэтай правінцыі Донг Хао. Візіт стаў працягам тых адносін, якія ўсталяваліся ў 2004—2005 гг. Тады паміж Белдзяржуніверсітэтам і універсітэтам Харбіна былі падпісаныя пагадненні ў галіне адукацыі і навукі.

Візіт на пачатку мая таксама меў станоўчыя вынікі. Сёлета абмяркоўваліся перспектывы далейшага развіцця двухбаковага супрацоўніцтва. Замежныя госці разглядалі магчымасці выкарыстання новых навуковых распрацовак БДУ. Асабліва іх цікавілі найноўшыя тэхналогіі ў сельскай гаспадарцы і медыцыне. Менавіта таму ў складзе дэлегацыі прыбылі кіраўнікі акадэміі медыцыны і сельскагаспадарчага інстытута.

Валянціна КЛЯНІЦКАЯ

СЁННЯ Ў НУМАРЫ:

СТУДЭНЦКАЕ САМАКІРАВАННЕ Ў БДУ
Стар. 2

"МЫ АДЧУВАЕМ ЗА САБОЙ МОЦНУЮ ПАДТРЫМКУ БДУ"
Інтэрв'ю з рэктарам РІВШ Міхаілам Іванавічам ДЗЕМЧУКОМ
Стар. 3

ВЕСТКІ З РЭКТАРАТА

Адбылася сустрэча першага прарэктара Сяргея Рахманава з Паслом Ізраіля ў Беларусі Зеевам Бен-Ар'е, на якой былі абмеркаваны пытанні далейшага супрацоўніцтва ў навуцы і адукацыі.

Выязное пашыранае пасяджэнне рэктарата БДУ прайшло на гістарычным факультэце. Абмяркоўвалася арганізацыя самастойнай работы студэнтаў на факультэце.

Рэктар БДУ Васіль Стражаў і першы прарэктар Сяргей Рахманаў прынялі ўдзел у агульным сходзе Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі. З боку БДУ выказана прапанова больш актыўна і сур'ёзна каардынаваць намаганні НДІ, ВНУ, галіновай навукі для вырашэння актуальных праблем эканомікі краіны

Першы прарэктар БДУ С. Рахманаў прыняў удзел у працы навукова-інавацыйнай секцыі, якая дзейнічала падчас візіту прадстаўнікоў кіраўніцтва Паўднёва-Усходняй акругі Расіі ў Беларусь. Абмяркоўвалася магчымасць рэалізацыі праектаў БДУ ў Расіі разам з вядучымі універсітэтамі Паўднёва-Усходняга рэгіёну.

Дэлегацыя БДУ на чале з першым прарэктарам С. Рахманавым наведала Маскоўскі дзяржаўны універсітэт, дзе пазнаёмілася з арганізацыяй міждысцыплінарных навуковых даследаванняў і адукацыі. Плануецца, што ў БДУ праца ў гэтым кірунку будзе весціся больш інтэнсіўна.

Адбылася сустрэча рэктара БДУ В. Стражава з паслом АБСЕ ў Беларусі Оке Петэрсанам, на якой абмяркоўваліся магчымасці супрацоўніцтва.

Рэктар БДУ В. Стражаў сустрэўся з новым Паслом Украіны ў Беларусі Валянцінам Налівайчанкам. Пасол азнаёміўся з працай кабінета ўкраінскай філалогіі на філалагічным факультэце.

Паводле інфармацыі прэс-службы БДУ

З ПЕРШЫХ КРЫНІЦ

ВУЧЫМСЯ КІРАВАЦЬ

Падчас навучання ў БДУ маладыя людзі становяцца не толькі спецыялістамі ў абранай сферы: яны вучацца быць актыўнымі грамадзянамі сваёй краіны. Ва універсітэце студэнтаў прыцягваюць да розных відаў значнай для грамадства дзейнасці, спрыяюць студэнцкай творчасці, ініцыятыве ў пошуку аптымальных формаў і метадаў самастойнага атрымання ведаў і навыкаў. Усё гэта неабходна, каб даць магчымасць маладым людзям для самарэалізацыі, самасцвярджэння і сацыялізацыі.

Як пабудавана сістэма студэнцкага самакіравання ў БДУ расказвае начальнік управлення выхаваўчай работы з моладдзю Павел СКАЛАБАН:

— Студэнцкае самакіраванне ў нашым універсітэце мае шырокую падтрымку з боку адміністрацыі і педкалектыву універсітэта. Значным стымулам студэнцкай дзейнасці і падтрымкі студэнцкіх ініцыятываў стаў конкурс грантаў "Лепшы маладзёжны праект", а таксама конкурс на лепшую малатыражную студэнцкую газету. Маладзёжныя актывісты пастаянна павышаюць узровень сваіх ведаў і кваліфікацыі. У гэтым напрамку дзейнічаюць рэгулярныя "Школа актыву", "Школа маладога лідэра". Акрамя таго, студэнцкія лідэры часта сустракаюцца з прадстаўнікамі кіраўнічых органаў дзяржавы.

Вельмі важна, каб студэнт быў асабіста зацікаўлены ў навучальна-выхаваўчым працэсе. Для гэтага мы прыцягваем студэнтаў да фарміравання і рэалізацыі адукацыйнай палітыкі універсітэта. Студэнты могуць уплываць на розныя кірункі дзейнасці універсітэта — на арганізацыю навучальнага працэсу, стварэнне нарматыўных дакументаў і г.д. Многія лідэры студэнцкіх арганізацый і органаў студэнцкага самакіравання ўваходзяць у Вучоны савет БДУ.

Дзейнасць органаў і структураў студэнцкага самакіравання дае магчымасць студэнтам адчуць значнасць сваёй ролі ў арганізацыі навучальна-выхаваўчага працэсу і адказнасць за яго вынікі.

Студэнцкае самакіраванне ва універсітэце прадстаўлена некалькімі структурамі.

Студэнцкі саюз БДУ падтрымлівае ініцыятывы, накіраваныя на развіццё студэнцкага самакіравання, міжнароднага маладзёжнага супрацоўніцтва, валанцёрскай дзейнасці.

Пярвічная арганізацыя грамадскага аб'яднання "Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі" (з правамі раённага камітэта) падтрымлівае ініцыятывы, скіраваныя на выхаванне пачуццяў патрыятызму, пераемнасці пакаленняў, узаемадзейнічае з Саветам ветэранаў БДУ, спрыяе другаснай занятасці студэнтаў.

Савет старастаў БДУ інфармуе студэнтаў пра падзеі ў навуковым, грамадскім, спартыўным і культурным жыцці універсітэта, а таксама абмяркоўвае з кіраўніцтвам БДУ праблемы, якія ўзнікаюць у студэнтаў падчас навучання.

Савет па матэрыяльным стымуляванні і аказанні матэрыяльнай дапамогі студэнтам і аспірантам БДУ прымае рашэнні пра ўстанаўленне надбавак і размеркаванні матэрыяльнай дапамогі студэнтам і аспірантам універсітэта.

Студэнцкі савет па якасці адукацыі БДУ спрыяе павышэнню якасці адукацыі ў БДУ, адлюстроўвае пазіцыю студэнтаў да дзейнасці універсітэта ў гэтай сферы, уносіць прапановы па арганізацыі навучальнага працэсу.

Акрамя таго, дзейнічае прафсаюзная арганізацыя студэнтаў.

Настасся ГВАРДЗІЯН, старшыня Студэнцкага саюза БДУ, студэнтка III курса механіка-матэматычнага факультэта:

— Адна з асноўных мэтаў арганізацыі — аб'яднаць студэнтаў універсітэта, адрадзіць і падтрымаць сапраўдны дух студэнцтва. Студэнцкі саюз БДУ з'яўляецца органам самакіравання, які актыўна падтрымлівае ініцыятывы студэнцтва. Студсаюз БДУ мае статус юрыдычнай асобы, што дапамагае нам заключаць дамовы на арганізацыю студэнцкіх атрадаў, наладжваць супрацоўніцтва са студэнцкімі арганізацыямі іншых краін. Таксама абмяркоўваюцца сумесныя праекты па маладзёжнай праблематыцы. Студсаюз БДУ – член Еўразійскай Студэнцкай асацыяцыі, якая аб'ядноўвае больш за 60 універсітэтаў СНД.

Многія студэнты з задавальненнем удзельнічаюць у будаўнічых атрадах, займаюцца валанцёрскай дзейнасцю, працуюць у грамадскіх прыёмных камісіях і г.д. У нас ёсць свая газета — "Обратная связь". Кожны студэнт БДУ можа звярнуцца да нас з прапановамі, і мы будзем імкнуцца разам рэалізаваць цікавыя праекты (stud_union_bsu@mail.ru).

ШКОЛА МАЛАДОГА ЛІДЭРА

У "Школе маладога лідэра" ў Акадэміі кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь сёлета прымалі ўдзел 6 прадстаўнікоў БДУ: Вольга Бакаленка (юрыдычны факультэт), Віталь Рабцаў (факультэт міжнародных адносін), Дзмітрый Чурносаў (юрыдычны факультэт), Ганна Ядлоўская (філалагічны факультэт), Настасся Канцэвіч (механіка-матэматычны факультэт), Наталля Наздрын-Платніцкая (хімічны факультэт).

Што даў маладым людзям удзел у гэтым праекце? В. Бакаленка кажа, што яна значна пашырыла сваё кола знаёмстваў: "Там сабраліся энергічныя, цікавыя людзі з розных ВНУ Мінска". Дз. Чурносаў згадвае, што самым запамінальным быў занятак, дзе прапанавалі стварыць "Казачны горад": "Студэнты маглі выказаць свае погляды на свет, але не той, які нас атачае ці ў якім ім хацелася б жыць, а свет, дзе кожны ёсць часткай адзінага цэлага. Такія заняткі дапамагаюць маладым лідэрам умацаваць сваю пазіцыю, набыць якасці, неабходныя лідэру, абмяняцца інфармацыяй і досведам".

Святлана ДАЛГАНЮК

Пра студэнцкае самакіраванне ў студгарадку распавядае яго дырэктар Міхаіл ЧАРАПЕННІКАЎ:

— Сістэма студэнцкага самакіравання ў студгарадку — гэта зладжаны механізм. Дзякуючы ёй студэнты атрымліваюць рэальную магчымасць супрацоўнічаць з усімі структурнымі падраздзяленнямі універсітэта і ўдзельнічаць у ажыццяўленні праграм універсітэта і маладзёжнай палітыцы. Каардынацыя самакіравання ў студгарадку ажыццяўляецца цэлай сістэмай органаў.

У склад Студэнцкага савета інтэрната, які выбіраецца на агульным сходзе жыхароў тэрмінам на 1 год, уваходзяць старшыня студсавета, яго намеснік, сакратар, камандзір аператрада і прадстаўнікі камісій — пажыўной, жыллёва-бытавой, інфармацыйнай, культурна-масавай, спартыўнай. Пры неабходнасці могуць стварацца і іншыя камісіі. Студсавет забяспечвае эфектыўнае функцыянаванне студэнцкага калектыву, назірае за выкананнем Правілаў унутранага распарадку, арганізоўвае прафілактыку правапарушэнняў, праводзіць мерапрыемствы, накіраваныя на фарміраванне здаровага ладу жыцця студэнтаў.

Аператыўны атрад інтэрнатаў кантралюе прапускную сістэму і ахоўвае правапарадак у інтэрнатах. Пры неабходнасці аператрад узаемадзейнічае з прадстаўнікамі органаў МУС.

Каардынацыйны савет студсаветаў інтэрнатаў БДУ разглядае пытанні арганізацыі выхаваўчай, сацыяльна-бытавой работы і вольнага часу ў студгарадку БДУ.

Савет па прафілактыцы парушэнняў Правілаў унутранага распарадку ў інтэрнатах ладзіць прававую асвету студэнтаў, прымае прафілактычныя меры ад парушэнняў унутры інтэрната, разглядае асабістыя справы студэнтаў, пытанні засялення і высялення.

Грамадская інфармацыйная служба — добраахвотнае студэнцкае аб'яднанне, галоўнымі функцыямі якога з'яўляюцца выпуск газеты "Студенческий городок" і малатыражных газет інтэрнатаў, арганізацыя "круглых сталоў", сустрэч студэнтаў з кіраўніцтвам універсітэта і студгарадка, дзеячамі культуры і г.д.

Студэнцкая творчая лабараторыя распрацоўвае інавацыйныя формы арганізацыі вольнага часу студэнтаў у інтэрнаце. Лабараторыя фарміруецца з прадстаўнікоў культурна-масавых камісій студсаветаў, а таксама сацыяльна актыўных і творчых студэнтаў.

Студэнцкі спартыўна-турысцкі клуб прапагандуе здаровы лад жыцця, масавы студэнцкі спорт, праводзіць турысцкія паходы, злёты, спаборніцтвы.

"ГАРАЧАЯ ЛІНІЯ" СЛУХАЕ...

"Студэнцкая гарачая лінія" (тэлефон 209-54-16) пачала сваю дзейнасць у БДУ. Яна створана для своечасовага рэагавання на канкрэтныя факты, кваліфікаванае вырашэнне студэнцкіх пытанняў і прапановаў па ўдасканальванні навучальна-выхаваўчага працэсу, іншых аспектаў дзейнасці ВНУ. Работа "гарачай лініі" ажыццяўляецца ў адпаведнасці з распараджэннем Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь "Аб арганізацыі аператыўнай зваротнай сувязі са студэнтамі".

Акрамя таго, свае заўвагі, звароты і пытанні студэнты могуць адрасаваць рэктару універсітэта, апусціўшы ліст у скрыні "Пытанні рэктару", якія стаяць у кожным навучальным корпусе.

Віталь РАБЦАЎ, сакратар грамадскага аб'яднання БРСМ БДУ, студэнт IV курса факультэта міжнародных адносін:

— Наша галоўная задача — даць магчымасць кожнаму студэнту паказаць сябе ў той ці іншай сферы ў канкрэтных справах. Мы выхоўваем лідэраў, будучых кіраўнікоў. Выхоўваем культуру кіравання, культуру зносін. Студэнты ўдзельнічаюць у розных акцыях — дапамога ветэранам, дзецям-сіротам у дзіцячых дамах. Можам дапамагчы знайсці працу ў вольны ад навучання час з дапамогай Студэнцкага цэнтра занятасці. Можам прапанаваць працу ўлетку: валанцёрскую працу, будаўнічыя, педагагічныя, сельскагаспадарчыя атрады. Нашы студэнты ўдзельнічалі ў будаўніцтве Нацыянальнай бібліятэкі. Гэтым летам яны будуць працаваць на будаўніцтве гасцініцы "Еўропа", САК "Брыганціна", на спартыўным комплексе універсітэта на вул. Кастрычніцкай.

Віктар БУКАТА, старшыня Савета старастаў БДУ, студэнт V курса факультэта прыкладной матэматыкі і інфарматыкі:

— У кожнай студэнцкай групе ёсць староста, ёсць старасты плыняў, курсаў, факультэтаў. Універсітэцкі савет старастаў аб'ядноўвае ўсіх старастаў факультэтаў. Усё, што хвалюе студэнтаў, мы абмяркоўваем на сваіх пасяджэннях, інфармуем кіраўніцтва універсітэта, а звесткі, якія ідуць ад адміністрацыі БДУ, мы даводзім да кожнага студэнта ў групе.

Нашу дзейнасць рэгламентуе Палажэнне аб Савеце старастаў БДУ. Старасты ёсць у кожнай студэнцкай групе, і звычайна па ўсіх пытаннях, якія ўзнікаюць падчас навучання, студэнты звяртаюцца менавіта да старасты.

ВУЧОБА ПРАФАКТЫВУ

Выязная вучоба прафактыву прайшла ў красавіку ў САК "Брыганціна". У ёй прынялі ўдзел старшыні прафбюро факультэтаў і прафоргі груп.

Загадчыца аддзела прававой абароны Ларыса Манюк і намеснік старшыні ЦК Беларускага прафсаюза работнікаў адукацыі і навукі Раман Дапіра пазнаёмілі актыў з арганізацыйна-статутнай працай у пярвічнай прафсаюзнай арганізацыі, з працоўнымі правамі і сацыяльна-эканамічнай абаронай маладых спецыялістаў. Быў адведзены час і для спартыўных мерапрыемстваў — тэніс, валейбол, дарц. "Такія мерапрыемствы патрэбныя, бо яны яднаюць арганізацыю. Надалей мы плануем арганізаваць вучобу на больш працяглы тэрмін", — падзялілася ўражаннямі старшыня прафсаюзнай арганізацыі студэнтаў БДУ Ніна Радзевіч.

Надзея ДРЫЛА

«БРЫГАНЦІНА» ДЛЯ АКТЫВІСТАЎ

5—7 мая на базе САК "Брыганціна" прайшоў чарговы выязны семінар-практыкум "Школа студэнцкага актыву БДУ". Галоўная мэта семінара — павышэнне якасці і плённасці работы інфраструктуры студгарадка.

Акрамя работы па 6 секцыях (для прававых камісій і сакратароў студэнцкіх саветаў, для жыллёва-бытавых камісій, для культурна-масавых, для інфармацыйных камісій студсаветаў грамадскай інфармацыйнай службы, для старшынь і намеснікаў старшынь студсаветаў, для спартыўных камісій і Студэнцкага спартыўна-турысцкага клуба) і дыскусіі па праблемах студэнцкага самакіравання, удзельнікаў семінара чакала надзвычай насычаная праграма: экскурсія да мемарыяльнага комплексу "Лінія Сталіна", лекцыя рэктара БДУ прафесара Васіля Стражава "Сучасныя ўяўленні пра Сусвет" з цыкла "Я. Навука. Свет", вечар аўтарскай песні, творчая праграма "Студэнцкі гарадок прапануе...", дыскатэка, спартакіяда, урачыстае закрыццё Кубка Дырэкцыі, мастацкі марафон "Інтэрнат — мой дом".

Сняжана ЛІСОЎСКАЯ

Людміла АРЛОЎСКАЯ, старшыня Студэнцкага савета па якасці адукацыі, студэнтка III курса юрыдычнага факультэта:

— Студэнцкі савет па якасці адукацыі існуе з 2003-га, а ў цяперашнім складзе — з лістапада 2005 года. У савет уваходзяць старшыні факультэцкіх саветаў. Галоўнае яго прызначэнне — садзейнічаць павышэнню якасці адукацыі ў БДУ. Іншыя задачы савета — наладжванне зваротнай сувязі паміж студэнтамі і адміністрацыяй БДУ, адлюстраванне адносін студэнтаў да дзейнасці універсітэта па арганізацыі навучальнага працэсу, кампетэнтнасці выкладчыкаў, праблеме наведвання заняткаў і інш. Студэнцкі савет выпрацоўвае мерапрыемствы па вырашэнні гэтых і іншых праблем, прапануе канкрэтныя крокі для паляпшэння сітуацыі. У полі нашай дзейнасці не толькі такія маштабныя праблемы, як, напрыклад, функцыянаванне фундаментальнай бібліятэкі БДУ або якасць выкладання ва універсітэце, — мы ўважліва ставімся і да кожнага асабістага пытання або праблемы студэнтаў. У нашых пасяджэннях заўсёды можа ўдзельнічаць кожны студэнт.

Свае пытанні і прапановы можна дасылаць на электронны адрас sko-bsu@tut.by, а таксама звяртацца ва ўпраўленне выхаваўчай работы з моладдзю, дзе заўсёды можна пакінуць інфармацыю для нашага Савета.

Ніна РАДЗЕВІЧ, старшыня пярвічнай прафсаюзнай арганізацыі студэнтаў:

— Пярвічная прафсаюзная арганізацыя студэнтаў абараняе прафесійныя, працоўныя, сацыяльна-эканамічныя правы і законныя інтарэсы сваіх членаў. Студэнцкі прафсаюз займаецца прававым забеспячэннем навучальна-вытворчых адносін, грамадскім кантролем за выдзяленнем ільготаў, гарантыяў, кампенсацыяў у адпаведнасці з заканадаўствам Беларусі. Прафсаюзная арганізацыя займаецца адпачынкам і санаторна-курортным лячэннем, кантролем за арганізацыяй харчавання і вырашэннем жыллёва-бытавых пытанняў, арганізацыяй вольнага часу, спартыўных мерапрыемстваў, бясплатнай юрыдычнай дапамогай і матэрыяльнай дапамогай. Таксама мы праводзім акцыі для студэнтаў-інвалідаў, дзяцей-сірот; сумесныя мерапрыемствы з грамадскімі арганізацыямі, факультэтамі, ВНУ.

Прафсаюзны камітэт рыхтуе навагоднія падарункі дзецям студэнтаў і аспірантаў, купляе і распаўсюджвае па ільготных цэнах ці бясплатна білеты на дыскатэкі, у тэатры, на КВЗ і іншыя забаўляльныя мерапрыемствы.

Міхаіл ДЗЯМЧУК:

АСОБЫ

“МЫ АДЧУВАЕМ ЗА САБОЙ МОЦНУЮ ПАДТРЫМКУ БДУ”

Рэктар Рэспубліканскага інстытута вышэйшай школы доктар фізіка-матэматычных навук, член-карэспандэнт НАН Беларусі Міхаіл Іванавіч ДЗЯМЧУК 28 мая адзначыць сваё 60-годдзе. На наступны дзень у зале пасяджэнняў Вучонага савета БДУ адбудзецца ўрачыстае пасяджэнне Вучонага савета РІВШ і ўшанаванне яго рэктара. А для газеты “Універсітэт” больш за ўсё цікава ўспомніць з юбілярам яго студэнцкія гады і паразважаць пра альма-матэр. Тым больш што БДУ таксама святкуе ў гэтым годзе юбілей.



— Вы скончылі фізічны факультэт БДУ. Каб была магчымасць выбару: вучыцца ў тыя гады, калі Вы былі студэнтам, або цяпер — што б Вы выбралі?

— Напэўна, выбраў бы той час. І калі б давялося выбіраць факультэт, то я зноў паступаў бы на фізічны, бо я ніколі пра гэта не шкадаваў.

— Якія моманты са студэнцкіх гадоў Вам успамінаюцца часцей?

— Мае самыя яркія ўспаміны пра студэнцтва — гэта будаўнічыя атрады: мы былі і ў Казахстане, і ў Цюменскай вобласці... У студэнцкіх атрадах чалавек выяўляе свой сапраўдны характар, вучыцца працаваць у калектыве, прымаць сумесныя рашэнні — адным словам, вучыцца быць самастойным. Гэта сапраўдная школа жыцця!

— Якім быў універсітэт у гады Вашага студэнцтва? Як ён змяніўся за гэтыя гады?

— І ў той час, і цяпер універсітэт быў і застаецца галоўнай ВНУ краіны. Гэта адчуваецца і па ўзроўні ведаў студэнтаў, якія прыходзяць сюды: ідуць толькі найлепшыя. Прыемна, што захаваліся і традыцыі класічнага універсітэта. Некаторыя змены я назіраю ў навуковай сферы: цікавасць да прыродазнаўчых навук сёння ў цэлым значна меншая, чым раней. Але я думаю, што гэта часовая з’ява, як і мода на эканамічныя і міжнародныя спецыяльнасці. Для нашай краіны магчымы толькі адзіны шлях развіцця — інавацыйны, калі робіцца стаўка на навуку, таму і фізіка, і хімія, і іншыя навукі будуць у хуткім часе запатрабаваныя. Хоць трэба сказаць, што асноўныя прарывы ў навукова-тэхнічным прагрэсе на сучасным этапе адбываюцца не ў адной навуковай плыні, а на стыку спецыяльнасцяў, таму для пазнання свету неабходна высокая міждысцыплінарнасць у навучанні. А гэта значыць, будуць з непазбежнасцю стварацца новыя дысцыпліны і трансфармавацца многія класічныя.

— Вы шмат гадоў працуеце ў сферы навукі. Якімі Вам бачацца перспектывы айчыннай фізікі?

— Ёсць некалькі кірункаў, дзе беларускія навукоўцы на сусветным узроўні займаюць высокія пазіцыі — напрыклад, у лазерных тэхналогіях і тэхніцы. Будучыня беларускай фізікі залежыць ад інвестыцый дзяржавы ў гэтую сферу дзейнасці і ад узаемадзеяння навукі з практыкай. Гэта ўсё цесна ўзаемазвязана. Калі эканоміка адчуе ўклад навукі, то яна пачне больш падтрымліваць навуку.

— У свой час Вы займалі пасаду міністра народнай адукацыі, віцэ-прэм’ера. Гэта быў канец 80-х — пачатак 90-х мінулага стагоддзя, калі пачыналася перабудова звыклага ладу жыцця. Што сёння засталося з тых пераменаў?

— Гэта быў няпросты для сістэмы адукацыі час. Да 90-х гадоў уся сістэма была стандартызаваная: усе навучальныя ўстановы (школы і ВНУ) былі роўныя, аднолькавыя. На пачатку 90-х ужо сталі з’яўляцца школы, напрыклад, з паглыбленым вывучэннем прадметаў, з профільным навучаннем, пачалі стварацца першыя ліцэі, гімназіі. Тады пры маім удзеле быў створаны і ліцэй БДУ. На той час гэта былі дастаткова рызыкоўныя праекты, бо арганізаваць ліцэй для адораных дзяцей — гэта значыла нібы парушыць сацыяльную справядлівасць. Была нават вялікая дыскусія, у тым ліку ў рэспубліканскай і саюзнай прэсе. Усё гэта не толькі засталося, але і атрымала новае развіццё.

Акрамя таго, з маім удзелам былі арганізаваны Вышэйшая атэстацыйная камісія, Дзяржаўны камітэт па навуцы і тэхналогіях, Белдзяржпатэнт і іншыя значныя структуры.

— Цяпер Вы ўзначальваеце РІВШ. Як Вы ацэньваеце яго ролю ў развіцці вышэйшай адукацыі ў краіне?

— Раней РІВШ быў пераважна цэнтрам павышэння кваліфікацыі для спецыялістаў-гуманітарыяў і не з’яўляўся нечым прынцыпова важным для развіцця вышэйшай школы, чым ён стаў сёння. Цяпер мы — адна з самых значных складовых частак сістэмы вышэйшай школы краіны: тут “варыцца” ўся нарматыўная, навуковая база развіцця вышэйшай школы, праходзяць павышэнне кваліфікацыі спецыялісты розных узроўняў — ад выкладчыкаў да рэктараў, якія пасля праводзяць дзяржаўную палітыку ў сферы адукацыі ў жыццё. Разам з галіновым міністэрствам мы вызначаем усе адукацыйныя стандарты, навучальныя планы і г.д. Можна ўпэўнена сказаць, што за апошнія гады мы стварылі новы інстытут з новым патэнцыялам, які адпавядае галоўным задачам рэфармавання вышэйшай школы.

— А наколькі важна для РІВШ супрацоўніцтва з БДУ?

— Нягледзячы на тое, што ў юрыдычнай назве РІВШ прыстаўка “БДУ” знікла, мы па-ранейшаму ўваходзім у структуру Беларускага дзяржаўнага універсітэта. Наш інстытут працуе на ўсю вышэйшую школу краіны, але нам вельмі важна ўсведамляць сябе менавіта часткай БДУ. Тады мы адчуваем за сабой моцную падтрымку і сур’ёзны патэнцыял, які выкарыстоўваем для вырашэння агульных задач. У краіне каля 300 розных інстытутаў і цэнтраў, якія займаюцца павышэннем кваліфікацыі. Але РІВШ, лічым, — самы вядомы і моцны. Мы запрашаем найлепшых спецыялістаў з БДУ чытаць у нас адпаведныя курсы, і працуюць у нас сапраўдныя прафесіяналы. Такім чынам, БДУ і РІВШ — гэта сапраўднае двухбаковае плённае супрацоўніцтва.

Гутарыла Сняжана ЛІСОЎСКАЯ
Фота аўтара

Міхаіл Іванавіч Дзямчук нарадзіўся 28 мая 1946 г. у вёсцы Дзяваткі Кобрынскага раёна. У 1968 г. закончыў БДУ, у 1970—1976 гг. працаваў малодшым, а потым старшым навуковым супрацоўнікам, у 1976—1984 гг. — загадчыкам лабараторыі НДІ прыкладных фізічных праблем БДУ. Быў загадчыкам кафедры аўтаматызацыі навуковых даследаванняў БДУ (1983—1985). У 1985 г. узначаліў аддзел навукі і навучальных устаноў ЦК КПБ. У 1988 г. стаў міністрам народнай адукацыі БССР, у 1991 г. — намеснікам Старшыні Савета Міністраў Беларусі. З 1994 г. працаваў рэктарам Беларускай дзяржаўнай політэхнічнай акадэміі. У 2000 г. быў прызначаны намеснікам прэм’ер-міністра Беларусі, у 2001 г. — дырэктарам Цэнтра сістэмнага аналізу БДПА. З 2002 г. працуе рэктарам Рэспубліканскага інстытута вышэйшай школы.

Сфера навуковых інтарэсаў Міхаіла Іванавіча — навуковае прыбора- і машынабудаванне, сістэмны аналіз і арганізацыйнае праектаванне. У 1983 г. яму была нададзена ступень доктара фізіка-матэматычных навук, у 1986 г. ён стаў членам-карэспандэнтам НАН Беларусі. Навуковыя заслугі М. Дзямчука адзначаныя прэміяй Ленінскага камсамолу ў галіне навукі (1974), Дзяржаўнай прэміяй БССР у галіне навукі і тэхнікі (1986). У 1996 г. ён атрымаў званне “Заслужаны дзеяч навукі Рэспублікі Беларусь”.

У 1986 г. абраны дэпутатам Вярхоўнага Савета БССР, у 1989 г. — народным дэпутатам СССР.

Міхаіл Іванавіч мае больш за 300 навуковых работ, у тым ліку 3 манаграфіі і 40 вынаходстваў. Ён старшыня Прэзідыума Міжнароднай акадэміі тэхнічнай адукацыі (1995), акадэмік Міжнароднай акадэміі арганізацыйных і кіраўніцкіх навук (1994), акадэмік Міжнароднай акадэміі навук вышэйшай школы (1993), акадэмік Беларускай інжынернай тэхналагічнай акадэміі (1995), галоўны рэдактар часопіса “Известия Международной академии технического образования”.

ПАДЗЕІ

СМІ БДУ АДЗНАЧЫЛІСЯ НА МЕДЫЯФОРУМЕ

X Міжнародная спецыялізаваная выстава “СМІ ў Беларусі” прайшла 3—6 мая ў Нацыянальным выставачным цэнтры “БелЭкспа”: на ёй экспанавалася больш за 100 стэндаў газет, часопісаў, тэлебачання і радыё, найноўшых мультымедыя- і Інтэрнэт-тэхналогій не толькі з усёй Беларусі, але і з іншых краін. Наш універсітэт быў прадстаўлены часопісамі “Веснік БДУ”, “Социология”, газетамі “Універсітэт” і “Студенческий городок”. Наведнікі выставы, асабліва былыя выпускнікі БДУ і яго сёлетнія абітурыенты, шчыра цікавіліся жыццём “Універсітэта”. За чатыры дні выставы было распаўсюджана больш за 500 розных выпускаў газеты “Універсітэт” і “Студенческий городок”.

Ірына ШЫК
Фота Юліі ПАПОВАЙ

БДУ ў СМІ Беларусі

На старонках рэспубліканскіх СМІ, Інтэрнэт-сайтах адлюстраваны наступныя падзеі і даты, звязаныя з Белдзяржуніверсітэтам.

Адкрыццё на філалагічным факультэце БДУ фальклорна-этнаграфічнага музея — **“Народная газета”** (29.04.2006, 18.05.2006), **“Вечерний Минск”** (16.05.2006), **“Минский курьер”** (05.05.2006), **“Звязда”** (19.05.2006).

85-годдзе з дня нараджэння першага дэкана факультэта журналістыкі Рыгора Булацкага — **“Советская Белоруссия”** (05.05.2006), **“Рэспубліка”** (05.05.2006).

Круглы стол “Беларуская літаратура ў XXI стагоддзі. Рэальнасць і шляхі развіцця” на філалагічным факультэце БДУ (час. **“Полымя”** № 4, 2006).

Святкаванне ў БДУ, прысвечанае Дню Перамогі, — **“Рэспубліка”** (05.05.2006).

Двухдзённы семінар “Абітурыент—студэнт—журналіст: падрыхтоўка прафесійных кадраў для рэгіянальных СМІ”, падрыхтаваны журфакам БДУ, у рэдакцыі газеты “Гродзенская праўда” — **“7дней”** (11.05.2006).

Дні беларускай мовы і літаратуры, якія праходзілі на філфаку БДУ, — **“Звязда”** (12.05.2006), **“Минский курьер”** (16.05.2006).

Першы форум студэнцкіх хароў “Папараць-кветка — 2006” у БДУ — **“Вечерний Минск”** (12.05.2006), **“Культура”** (13.05.2006).

Дні адкрытых дзвярэй у БДУ — **“Советская Белоруссия”** (13.05.2006), **“Звязда”** (16.05.2006), **“Рэспубліка”** (16.05.2006), Інтэрнэт-газета **“Беларускія навіны”** (12.05.2006).

Перамога ліцэістаў БДУ на міжнароднай Мендзялееўскай алімпіадзе па хіміі, якая прайшла ў Ерэване, — **“Вечерний Минск”** (16.05.2006), **“Народная газета”** (17.05.2006), **“Настаўніцкая газета”** (16.05.2006), **“Звязда”** (19.05.2006)

Пра гэтыя і іншыя падзеі ў БДУ шырока паведамлялі ў сваіх матэрыялах інфармацыйныя агенцтвы БЕЛТА, БелаПАН, ІНТЭРФАКС, АТН, тэлеканалы ЛАД, БТ, СТВ, АНТ, Беларускае радыё і FM-станцыі.

Агляд падрыхтаваны прэс-службай БДУ

АБ’ЯВЫ

УСТАНОВА БДУ “НАВУКОВА-ДАСЛЕДЧЫ ІНСТЫТУТ ФІЗІКА-ХІМІЧНЫХ ПРАБЛЕМ”

аб’яўляе конкурс
на замяшчэнне вакантных пасад:

старшага навуковага супрацоўніка лабараторыі лекавых сродкаў на аснове мадыфікаваных поліцукрыдаў;

навуковага супрацоўніка лабараторыі фізічнай хіміі і мадыфікацыі цэлюлозы;

навуковага супрацоўніка лабараторыі структурна-хімічнага мадыфікавання палімераў;

навуковага супрацоўніка лабараторыі хіміі кандэнсаваных асяроддзяў;

навуковага супрацоўніка лабараторыі хіміі кандэнсаваных асяроддзяў;

навуковага супрацоўніка лабараторыі фізіка-хімічных метадаў даследавання.

Тэрмін падачы дакументаў — 1 месяц з дня апублікавання аб’явы.

Дакументы прымаюцца на адрас: 220030, г. Мінск, вул. Ленінградская, 14, аддзел кадраў НДІ ФХП БДУ.

ДЗЯРЖАЎНАЯ ЎСТАНОВА АДУКАЦЫІ “РЭСПУБЛІКАНСКІ ІНСТЫТУТ ВЫШЭЙШАЙ ШКОЛЫ”

аб’яўляе конкурс
на замяшчэнне пасад прафесарска-выкладчыцкага складу:

загадчыка кафедры гісторыка-культурнай спадчыны Беларусі (1);

дацэнта кафедры гісторыка-культурнай спадчыны Беларусі (1);

дацэнта кафедры аховы працы і заканадаўства аб працы (0,5).

Тэрмін конкурсу — 1 месяц з дня апублікавання аб’явы.

Адрас: 220001, г. Мінск, вул. Маскоўская, 15, аддзел кадраў, пакой 215, тэл. 200-91-07.

НАВУКОВА-ДАСЛЕДЧАЯ ЎСТАНОВА “ІНСТЫТУТ ПРЫКЛАДНЫХ ФІЗІЧНЫХ ПРАБЛЕМ ІМЯ А.Н. СЕЎЧАНКІ” БДУ

аб’яўляе конкурс на замяшчэнне вакантнай пасады:

навуковага супрацоўніка па спецыяльнасці 05.11.07 (аптычныя і оптыка-электронныя прылады і комплексы).

Тэрмін конкурсу — 1 месяц з дня апублікавання аб’явы.

Дакументы накіроўваць на адрас: г. Мінск, вул. Курчатава, 7, тэл. 212-48-43.

“ІНСТЫТУТ ЯДЗЕРНЫХ ПРАБЛЕМ” БДУ

аб’яўляе конкурс
на замяшчэнне пасады

лабараторыя ядзернай спектраскапіі:

навуковы супрацоўнік (1).

Тэрмін конкурсу — 1 месяц з дня апублікавання аб’явы.

Адрас: 220030, г. Мінск, вул. Бабруйская, 11, аддзел кадраў, пакой 315, тэл. 226-42-31

ПАДПІСКА — 2006

“ВЕСНІК БДУ”

Пачалася падпіска на перыядычныя выданні на другое паўгоддзе 2006 года. Падпісная цана на часопіс “Веснік БДУ” па серыях:

Серыя I — фізіка, матэматыка, інфарматыка (№ 3, верасень): індывідуальная (індэкс 74851) — 9 060 р.; ведамасная (індэкс 748512) — 27 439 р.

Серыя II — хімія, біялогія, геаграфія (№ 3, кастрычнік): індывідуальная (індэкс 74852) — 9 060 р.; ведамасная (індэкс 748522) — 27 439 р.

Серыя III — гісторыя, філасофія, псіхалогія, паліталогія, сацыялогія, эканоміка, права (№ 2, ліпень; № 3, лістапад): індывідуальная (індэкс 74853) — 18 130 р.; ведамасная (індэкс 748532) — 54 879 р.

Серыя IV — філалогія, журналістыка, педагогіка (№ 2, жнівень; № 3, снежань): індывідуальная (індэкс 74854) — 18 130 р.; ведамасная (індэкс 748542) — 54 879 р.

Падпісацца на часопіс “Веснік БДУ” можна ва ўсіх аддзяленнях сувязі Рэспублікі Беларусь.

Часопіс “Веснік БДУ” ўсіх чатырох серый можна набыць у кіёску галоўнага корпуса БДУ (пр. Незалежнасці, 4) серый 3, 4 — у кіёску па вул. К. Маркса, 31(будынак гуманітарных факультэтаў БДУ), у кіёску “Універсітэцкая кніга” (вул. Ленінградская, 8).

Самы танны і надзейны спосаб атрымаць часопіс — гэта падпіска.

УНІВЕРСІТЭТ

25 мая 2006 года, № 11 (1941)

КНІЖНАЯ ПАЛІЦА

ВЫДАДЗЕНА Ў БДУ

Научный доклад на английском языке: планирование, письмо, редактирование = Student's research: planning, writing, editing. Дапаможнік для студэнтаў III курса факультэта філасофіі і сацыяльных навук і студэнтаў магістратуры скіраваны на фарміраванне прафесійна арыентаванага пісьмовага маўлення з улікам сацыяльна-культурных асаблівасцей пабудовы і афармлення навуковых работ.

Социология: методология отраслевых и оперативных исследований. У навучальным дапаможніку для студэнтаў сацыялагічных спецыяльнасцей БДУ разглядаюцца метадалагічныя асновы шэрага галіновых дысцыплін сацыялогіі, якія маюць вялікае значэнне для падрыхтоўкі спецыялістаў адпаведнай кваліфікацыі.

Л.Д. Бурко, В.В. Гричик. **Позвоночные животные Беларуси.** Навучальны дапаможнік разглядае асноўныя этапы фарміравання сучаснай фауны пазваночных, дае кароткую характарыстыку асаблівасцей распаўсюджання, біялогіі і экалогіі ўсіх відаў пазваночных жывёл, якія сустракаюцца на тэрыторыі Беларусі.

Управаўленне рэдакцыйна-выдавецкай работы БДУ

ВЫДАННІ ДЛЯ АБІТУРЫЕНТА

Колб Е.Г., Кохановский А.Г., Прохоров А.А., Темушев С.Н., Ходин С.Н. **Тесты по всемирной истории новейшего времени и истории Беларуси.** Тэставыя заданні могуць выкарыстоўвацца школьнікамі пры падрыхтоўцы да цэнтралізаванага тэсціравання па гісторыі, а таксама да ўступных экзаменаў па гісторыі ў ВНУ.

Лойка П.А. **Поўны курс па гісторыі Беларусі ў датах і падзеях.** Выданне змяшчае даты найважнейшых падзей з гісторыі Беларусі. Адрасуецца абітурыентам і школьнікам.

Рабенкова Г.А. **Сборник математических понятий и формул за курс средней школы.** У зборнік увайшлі ўсе матэматычныя тэрміны, панятці, формулы і тэарэмы, якія вывучаюцца ў сярэдняй школе, а таксама найважнейшыя задачы, якія ўключаюцца ў тэарэтычную частку школьных падручнікаў.

Кареев Д.В. **Человек, общество, государство в мире экономики: Человек в системе экономических отношений.** У дапаможніку для навучэнцаў і абітурыентаў у даступнай форме тлумачацца характар, структура, змест эканамічных працэсаў і іх роля ў сацыяльным жыцці і культуры чалавека.

Аддзел рэалізацыі РУП «Выдавецкі цэнтр БДУ»

ФАЛЬКЛОР І ЭТНАКУЛЬТУРА ЧАРНОБЫЛЯ

У Выдавецкім цэнтры БДУ з фінансавай падтрымкай Беларускага рэспубліканскага цэнтра фундаментальных даследаванняў выйшла манаграфія Васіля Ліцьвінкі "Фальклор і этнакультура Чарнобыля. З нагоды 20-годдзя сусветнай катастрофы". У кнізе раскрываецца станаўленне і развіццё фальклорна-этнічнай, абрадава-святочнай традыцыі на ўсходняй і цэнтральнай частках Палесся.

ПАЛЯВАННЕ НА ГАЎЛЯЙТЭРА

Прэзентацыя кнігі "Паляванне на гаўляйтэра" адбылася 17 мая ў бібліятэцы факультэта журналістыкі. У кнізе даследуецца аперацыя па знішчэнні генеральнага камісара Беларусі Вільгельма Кубэ. На падставе новых і маладаследаваных крыніц аўтары — дырэктар Нацыянальнага архіва Беларусі Вячаслаў Селяменеў і дацэнт кафедры тэорыі і метадалогіі журналістыкі журфака БДУ Віктар Шымолін — раскрылі таямніцы, якімі дагэтуль акутаны гэтыя падзеі.

Падрыхтавала Алена КУРХІНЕН

КАНФЕРЭНЦЫІ

ЖАНЧЫНА Ў СУЧАСНЫМ ГРАМАДСТВЕ

Навукова-практычная канферэнцыя "Жанчына. Культура. Грамадства", прысвечаная Году маці, адбылася 19—20 мая на базе спартыўна-аздараўленчага комплексу "Брыганціна". У ёй прынялі ўдзел спецыялісты ў галіне псіхалогіі, медыцыны, педыятрыі, гісторыі, філалогіі, мастацтва і педагогікі з БДУ, МДЛУ, Беларускага каледжа музыкі. Апрача пленарных пасяджэнняў, работа вялася па секцыях "Жанчына для грамадства, грамадства для жанчыны: стратэгія развіцця", "Роля жанчыны ў духоўным жыцці сучаснага грамадства: досвед і перспектывы", "Здароўе нацыі і праблемы экалогіі". Абмяркоўваліся праблемы аздараўлення дзяцей за мяжой, сацыялізацыі сучаснай моладзі, электрамагнітнай бяспекі, якасці касметычнай прадукцыі.

Мерапрыемства прайшло з ініцыятывы Саюза жанчын БДУ пры падтрымцы Савета жанчын Мінска.

Паводле інфармацыі прэс-службы БДУ падрыхтавала Валянціна КЛЯНІЦКАЯ

ВЕСТКІ З ФАКУЛЬТЭТАЎ

СЛАВЯНСКІ ВЕЧАР У БДУ

"Славянскі вечар" 18 мая адбыўся ўжо ў 36-ы раз. Яго заснавальнікам быў вядомы беларускі лінгвіст, прафесар БДУ Адам Супрун. Цяпер традыцыю правядзення мерапрыемства працягвае яго вучань — доктар філалагічных навук прафесар Барыс Норман, а таксама выкладчыкі і супрацоўнікі кафедры тэарэтычнага і славянскага мовазнаўства БДУ.

Сёлета фестываль супаў з 40-годдзем кафедры, таму першы нумар канцэрту прысвячаўся памяці А. Супруна. У госці да факультэта завіталі вядомая беларуская спявачка, студэнтка БДУ Карыяна, якая выканала сваю новую песню. "Брэменскія музыкі" з III курса забаўлялі публіку вясёлымі сцэнкамі. Студэнты і выкладчыкі спявалі песні, чыталі вершы, жартавалі на ўсіх славянскіх мовах, якія вывучаюць на філфаку: рускай, беларускай, польскай, сербскай, украінскай і чэшскай. Гасцямі "Славянскага вечара" сталі прадстаўнікі дыпламатычных місій славянскіх дзяржаў, акрэдытаваных у нашай краіне.

Алена НЕВЯДОМСКАЯ

ВЯЗЫНКА СУСТРАКАЛА ПАЛІГЛОТАЎ

Дзяржаўны літаратурны музей Янкі Купалы ў Вязынцы 20 мая правёў асветніцка-патрыятычную акцыю "Вязынка—2006". Больш за 300 студэнтаў і выкладчыкаў філалагічнага факультэта прынялі ўдзел у паэтычным і бардаўскім фестывалі. Яны выконвалі песні ўласнага сачынення на розных мовах свету і дэкламавалі вершы Янкі Купалы. Сярод гасцей быў вядомы бард Алесь Камоцкі, які прадставіў свой новы альбом "Дах". Таксама песні выканалі іншыя барды і аўтары студэнцкага альманаху "Скрыпторый".

Алена НЕВЯДОМСКАЯ

БЕЛАРУСКАЯ ХАТА ЗАПРАШАЕ

Адкрыццё фальклорна-этнаграфічнага музея адбылося ў рамках міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі "Фальклор і сучасная культура".

Пакуль у музеі (аўд. 38) прадстаўлена адна экспазіцыя — "Хата беларуская". Экспанаты для яе (прылады працы, сельскагаспадарчы інвентар і іншыя рэчы) фальклярысты пры кафедры беларускай літаратуры і культуры збіралі некалькі гадоў. Шмат рэчаў музей адтрымаў у дарунак ад студэнтаў і іх бацькоў. У хуткім часе на паліцах музея з'явіцца калекцыя кніг беларускіх пісьменнікаў, а таксама слоўнікі, энцыклапедыі, выданні па фальклоры. Плануецца арганізацыя экскурсій па Беларусі.

Ініцыятарам і арганізатарам адкрыцця музея, як і правядзення канферэнцыі выступіла прафесар, доктар філалагічных навук Ірына Казакова.

Алена НЕВЯДОМСКАЯ
Фота Юліі ПАПОВАЙ

ПАЧАСТАВАЛІ ГАРБАТАЙ

На факультэце дауніверсітэцкай адукацыі 18 мая адбылася традыцыйная вечарына "Рускі чай": сёлета мерапрыемства прысвячалася 85-годдзю БДУ і 45-годдзю факультэта. Традыцыйна на вечарыне замежныя навучэнцы дэманструюць свае веды ў авалодванні рускай мовай і беларускай культурай.

Паводле інфармацыі прэс-службы БДУ

КЛОПАТ ПРА КАДРЫ

Напрыканцы красавіка ў Гродне адбыўся семінар "Абітурыент — студэнт — журналіст: падрыхтоўка прафесійных кадраў для рэгіянальных СМІ", арганізаваны факультэтам журналістыкі БДУ разам з рэдактарамі раённых і гарадскіх газет. Перад абітурыентамі Гродзеншчыны выступілі выкладчыкі факультэта журналістыкі, якія расказалі пра ўмовы паступлення на спецыяльнасці факультэта ў 2006 г.

Таццяна МЕЛЬНІК

ВЫСТАВЫ

КНІГІ ЯДНАЮЦЬ УСІХ

22 мая ў зале інфармацыйных і электронных рэсурсаў БДУ адбылося ўрачыстае адкрыццё выставы "Навучальная літаратура маскоўскіх выдавецтваў для ВНУ". З прывітальным словам выступілі прарэктар па вучэбнай рабоце БДУ В. Самахвал, намеснік міністра інфармацыі, старшыня праўлення ГА "Беларуская асацыяцыя кнігавыдаўцоў і кнігараспаўсюднікаў" І. Лапцёнак і член Расійскай асацыяцыі кнігавыдаўцоў А. Філімонаў. На выставе прадстаўлена літаратура па навучальных дысцыплінах, пераважна гуманітарнага профілю: культуры і мастацтве, гісторыі, культурымовы, педагогіцы, сацыялогіі, філасофіі, мовазнаўстве і літаратуры, праве і палітыцы. Арганізатарам выставы стала Фундаментальная бібліятэка БДУ. Як лічаць яе супрацоўнікі, правядзенне выставы спрыяе ўмацаванню адносін з расійскімі выдавецтвамі і дае магчымасць набыць навучальную літаратуру.

Ірына ШЫК

"МАГІЯ" СВАІМІ РУКАМІ

Штогадовая выстава "Свет творчасці. Свет захаплення ў" заканчвае працу ў галоўным корпусе універсітэта. Арганізатарам яе выступіў Саюз жанчын Белдзяржуніверсітэта, і прысвячаецца яна Дню сям'і. Мэта выставы — раскрыць творчы патэнцыял студэнтаў, супрацоўнікаў БДУ і іх дзяцей. Малюнкі, вышыванкі, розныя вырабы з бісеру і пацерак, іншыя экспанаты былі аб'яднаныя тэмай "Твой цёплы дзень". У межах выставы размешчана аўтарская калекцыя мастака, члена Саюза майстроў народнай творчасці Беларусі Н. Бортнік "Жаночая магія".

Алена НЕВЯДОМСКАЯ
Фота аўтара

У ВОЛЬНЫ ЧАС

ЗНАЙСЦІ ПАПАРАЦЬ-КВЕТКУ

Першы форум студэнцкіх хароў "Папараць-кветка —2006" адбыўся ў БДУ 12—14 мая. Гэтае мерапрыемства прысвячалася юбілею нашага універсітэта. У фестывалі прынялі ўдзел студэнцкія хары БДУ, МДЛУ, БДЭУ і Магілёўскага дзяржаўнага універсітэтаў. Найстарэйшы з удзельнікаў "Папараць-кветкі — 2006", народны акадэмічны студэнцкі хор БДУ, сёлета адзначае сваё 60-годдзе.

Паводле інфармацыі прэс-службы БДУ

РЭДАКЦЫЙНАЯ ПОШТА

ЯК ЖЫВЕШ, ВАВЁРКА?

Добры дзень, паважаная рэдакцыя!

Піша вам група аспірантаў і студэнтаў філалагічнага факультэта БДУ. Звяртаемся да вас па параду і дапамогу. Многіх навучэнцаў нашага універсітэта вельмі непакоіць лёс вавёркі, якая жыве ў клетцы ва універсітэцкім дворыку. Падлога ў гэтай клетцы бетонная, а зусім побач – зялёная трава, куды вавёрцы відавочна хочацца. Клетка гэтая невысокая, там няма аніводнай зялёнай расліны. Мы разумеем жаданне ўпрыгожыць універсітэцкі дворык, але за што пакутуе гэтая жывёла?

На жаль, мы не ведаем, якая універсітэцкая структура адказвае за добраўпарадкаванне дворыка, таму звяртаемся да вас. Мы гатовыя скласці ліст і сабраць подпісы студэнтаў і ўсіх неабыякавых, каб для гэтай вавёркі былі палепшаныя ўмовы існавання ці каб яе ўвогуле адпусцілі: шмат жа ў Мінску паркаў, дзе жывуць вавёркі. Можа, рэдакцыя газеты магла б перадаць нашу прапанову на правільны адрас?

Просім вас, не заставайцеся абыякавымі. Можа, гэта падаецца дробязю ў параўнанні з іншымі праблемамі універсітэта, але вельмі балюча глядзець, як пакутуе гэтая жывёла.

Таццяна БАЛАШЧАНКА, Надзея ТУРОЎСКАЯ

* * *

Распараджэннем рэктара БДУ вальера для вавёрак у скверы галоўнага корпуса была пабудаваная ў 1999 г. Увосень таго ж года ў вальеру запусцілі двух сяголеткаў вавёркі звычайнай, якіх прывезлі з Іванаўскага раёна Брэсцкай вобласці. Вавёркі былі выхаджаныя мясцовымі жыхарамі пасля смерці іх маці. Жылі яны ў звычайнай клетцы, у якой трымалі трусоў (1 х 0,5 м).

Памеры нашай вальеры адпавядаюць біялагічным асаблівасцям віду і дазваляюць трымаць у ім да дзесятка вавёрак.

У рацыёне сутачнага харчавання вавёрак 14 назваў, у тым ліку вітаміны, якія забяспечваюць іх энергетычныя патрэбы (272 ккал/суткі). Сведчаннем іх здароўя з'яўляецца рэгулярная лінька (2 разы на год) і актыўнае перамяшчэнне па вальеры.

Уяўленне наведнікаў вальеры, што вавёркам нібыта хочацца траву, памылковае. Цэментавая падлога у вальеры, размешчанай па-за памяшканнем, забяспечвае неабходныя гігіенічныя ўмовы. Больш за тое, вавёрка ў натуральных умовах жыве ў каронах дрэваў і толькі ў крайнім выпадку перамяшчаецца па зямлі, снезе і нават па вадзе.

Працягласць жыцця вавёркі ў натуральных умовах 2—3 гады. Нашы вавёркі пражылі амаль 7 гадоў і, спадзяемся, пражывуць яшчэ столькі ж. Калі іх выпусціць за межы вальеры, яны загінуць: без дапамогі чалавека яны не здолеюць пракарміцца.

Л.Д. БУРКО,
дацэнт кафедры заалогіі

З УСМЕШКАЙ

***

На экзамене:

— Як даведацца аб'ём звестак, запісаных на дыскету?

— Узважыць дыскету да запісу і пасля запісу!

***

Прафесар:

— Назавіце два займеннікі...

Студэнт:

— Хто? Я?

***

Студэнт заходзіць у пакой, дзе сядзяць выкладчыкі, і кажа надрыўным тонам:

— Грамадзяне выкладчыкі! Даруйце, што я да вас звяртаюся. Сам я не тутэйшы, на вакзале скралі залікоўку з усімі адзнакамі. Зрабіце ласку, пастаўце, хто колькі можа!..

УНІВЕРСІТЭТ
Выдаецца з 1929 года

Заснавальнік газеты – Беларускі дзяржаўны універсітэт
Газета ўзнагароджана Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета БССР

Газета зарэгістравана Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь. Рэгістрацыйнае пасведчанне №149 ад 30 жніўня 2005 года

25 мая 2006 года
Падпісанада друку 24.05.2006 г.
Зак.496 . Тыраж 1000 экз.Ум. друк. арк 1.
Надрукавана ў РУП "Выдавецкі цэнтр БДУ"
ЛП № 02330/0056850 ад 30.04.2004.
220030, г. Мінск, вул. Чырвонаармейская, 6

Рэдактар Таццяна КАЗАК
Камп'ютарная вёрстка Валянціны КЛЯНІЦКАЙ
Адрас рэдакцыі: 220030, Мінск, прасп. Незалежнасці, 4
Прыёмная рэдакцыі: вул. Бабруйская, 7, пакой 411, тэлефон 209-53-45,
e-mail: gazeta@bsu.by; www.gazeta.bsu.by